М. І. Чмарава (*г. Магілёў*)

## МАСТАЦКАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ ПЕРШАПАЧАТКОВЫХ ЭТАПАЎ ВОЙНАЎ У ТВОРЧАСЦІ М. ГАРЭЦКАГА І В. БЫКАВА

Войны былі на зямлі ад пачатку стварэння свету. Яны здолелі пакінуць адбітак як на вялікія цывілізацыі, так і на маленькія краіны, і галоўнае – на жыццё цэлых пакаленняў. Таму нядзіўна, што вайна і мастацтва заўсёды ідуць побач. Творы мастакоў і пісьменнікаў сведчаць аб войнах не меньш яскрава, чым гістарычныя дакументы. А сама вайна становіцца той яркай падзеяй, што натхняе творчых асоб на яе мастацкае адлюстраванне. Беларусь, праз якую прайші шматлікія войны, не выключэнне. Нацыянальная літаратура мае ў сваёй скарбніцы тысячы твораў, прысвечаных ваенным падзеям розных часоў. А адны з лепшых належаць Максіму Гарэцкаму і Васілю Быкаву. Аўтары самі былі ўдзельнікамі войнаў пра якія пісалі, і таму паказвалі іх дакладна і рэалістычна. І Гарэцкі, і Быкаў – гэта не проста мастакі, яны яшчэ і “гісторыкі”, бо не апісваюць падзеі “зручнымі кавалкамі”, стараюцца не хаваць штосьці “сорамнае”, што можа не спадабацца ці напужаць. Пісьменнікі спадзяваліся, што апісаныя імі рэаліі адштурхнуць людзей ад жадання распачынаць новыя кравапралітныя “кампаніі”, якія не прыносяць нічога апроч разбурэння. Прычым разбурэння не толькі навакольнага і вонкавага, але і маральнага, духоўнага ў чалавеку. Аўтары паказваюць, што пасля вайны чалавек ўжо ніколі не здолее стаць ранейшым, не навучыцца так адчуваць і жыць, як рабіў гэта да яе. Яны паказваюць вайну як незваротны працэс. “Што было ўчора? Я жыў. Але ранейшага мяне навекі няма”, – думае Лявон Задума, а значыць сам Максім Гарэцкі, бо твор “На імперыялістычнай вайне” напісаны па матывах яго салдацкага дзённіка.

Цікава прасачыць за нейкім адным этапам вайны, адлюстраваным М. Гарэцкім і В. Быкавым, – бо кожны з этапаў прыносіў абсалютна розныя эмоцыі, падзеі ў жыццё чалавека. Калі звярнуць увагу менавіта на пачатак вайны, то становіцца зразумела, як шмат можа ён расказаць пра далейшае развіццё падзей, пра характар герояў твораў. Пачатковы перыяд немагчыма параўнаць з сярэдзінай вайны – калі кожны вызначыўся з сваёй роляй, і тым больш з яе канцом, калі мы бачым толькі фінал (якім бы ён не быў, трагічным ці святочным), але не бачым першапрычыны і вытокаў. Пачатак вайны паказвае людзей такімі, якімі яны ёсць на самой справе. Пісьменнікі дэманструюць, што кожны, хто жадае геройства, здольны пераўтварыцца ў здрадніка, а баязлівец, – нечакана для сябе, стаць смелым, і нават ахвяраваць сваё жыццё. Літаратурныя персанажы М. Гарэцкага і В. Быкава пытаюць сябе “што я тут раблю?!” і “што рабіць далей?!”, і шукаюць адказ на гэтыя пытанні. Іх светапогляд змяняецца, і з часам яны абіраюць свой шлях. Натуральна, што недзе аўтары, якія самі былі салдатамі, апісваюць свае перажыванні, недзе – тых, з кім стаялі ў адным шыхту. А ў выніку псіхалагічны партрэт іх жаўнера становіцца своеасаблівым адбіткам усёй вайны. М.Гарэцкі і В.Быкаў адлюстроўваюць вайну на фоне асабістых перажыванняў чалавека, на эмоцыях народа. Апісанні баёў, тэхнічныя моманты – яны падаюць як другасныя, акцэнтуючы ўвагу на пераменах ва ўнутраным свеце чалавека. Раскрываючы псіхалагічныя аспекты, пісьменнікі паказваюць, наколькі моцны ўплыў мелі “вярхі” на шэраговых людзей, як лёгка народ “праграмаваўся” на патрэбныя ім дзеянні. І разам з тым паказвалі моц створанага “натоўпу”, яго неабмежаваныя магчымасці.

У кнізе “На імперыялістычнай вайне” М. Гарэцкі апісвае момант, дзе людзі праводзяць на вайну тую частку царскай арміі, дзе служыць Лявон Задума. Тут трэба ўлічваць, што на той час яшчэ дакладна не было вядома, ці пачнецца яна. “Вольныя людзі прапускалі нас на станцыях як на вайну. Апраненыя бедна жанчыны выносілі вёдры вады, бегалі па колькі раз, не шкадуючы турбацыі, каб толькі мы ўсе напіліся. Беленькія паненкі, калі такія, што гаманілі па-расійску ці па-яўрэйску, а не па-польску, кідалі нам у вагоны краскі, а як цягнік адыходзіў, махалі хустачкамі і крычалі нешта вясёлае” [1, с. 15]. Гэтая рэакцыя людзей можа сведчыць не толькі аб іх рамантычным стаўленні да вайны, але і аб упэўненасці ў перамозе. І ня дзіўна, бо тагачасныя прадстаўнікі ўлады моцна ўбілі ў галовы людзей ідэю неперاможнасці цара, а значыць усёй Расійскай імперыі. Хутчэй за ўсё, арэол рамантызма не лунаў толькі над тымі, хто выпраўляў на вайну сваіх сваякоў ды сяброў... Яшчэ нейкі час салдаты з арміі Расійскай імперыі будуць адчуваць сябе адносна няблага. Па дарозе да мяжы, сяляне-жмогусы раздаюць ім сала і хлеб, а камандзіры забараняюць сваім жаўнерам “крыўдзіць абывацеля”, то бок красці ці адбіраць прадукты сілкавання. Мацей Мышка, герой-апавядальнік рамана “Віленскія камунары”

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

так характарызуе пачатак імперыялістычнай вайны ў Вільні: “Калі прыйшла вайна, у горадзе спачатку нічога не змянілася, толькі што вакзал, вуліцы і ўсюдых усё было забіта салдатамі. Таксама як і раней, людзі пілі, елі, спалі, жралі, а хто мусіў хадзіць на работу – хадзіў на работу. І кахаліся. І жаніліся, і дзяцей зачыналі”… [3, с.195]. Але калі пачынаецца эвакуацыя, людзі ўсіх чыноў і нацыянальнасцяў грузяць рэчы ў эшалоны і з’язджаюць з Вільні, спадзеючыся на хуткае вяртанне. А пройдзе яшчэ нейкі час і рускія газеты будуць крычаць: “Вільню ніколі не аддамо!”. Віленская польская інтэлігенцыя арганізоўвае напаўлегальную “міліцыю обыватэльску”, спадзеючыся, што немцы дазволяць ёй функцыянаваць, ды яшчэ і дапамогуць з узбраеннем. Але немцы, нямала расчараваўшы палякаў, загадваюць ўсім жыхарам горада здаць зброю.

Калі немцы прыходзяць у Вільню, людзям цікава на іх паглядзець. Жыхары горада, па-святочнаму апранутыя, дараць ім кветкі і папіросы. Мацей Мышка называе гэта “стаднай узбуджанасцю з прычыны перамены ў агульным жыцці горада”. М. Гарэцкі падкрэслівае, што па нямецкіх салдатах бачна, як яны згаладаліся, – так апантана яны скупаюць у крамах прадукты, якія даволі хутка растуць у кошце. Бедным віленчукам нават давялося з-за гэтага пагаладаваць. В. Быкаў мала ўвагі надае апісанню пачатка вайны ў сваіх творах, але ў аўтабіяграфічнай кнізе “Доўгая дарога дадому” ён распавядае, як адчувалі сябе маладыя салдацікі, якіх адпраўлялі на вайну. Варта адзначыць, што намаляваная ім карціна вельмі падобная на ўзгаданы раней момант выпраўлення на імперыялістычную вайну ў Гарэцкага. Бо і ў ваенных, і ў шэраговых людзей прысутнічае той жа настрой – аптымізм, упэўненасць, вера ў непераможнасць свайго правадыра і дзяржавы: “Тысячныя калёны 17–18-гадовых юнакоў пацягнуліся па пыльных дарогах на ўсход. Стаяла паўднёвая сьпёка. У сёлах і гарадках, дзе мы праходзілі, нас праводзілі дзяўчыны і дзяўчаты, давалі якую ежу, садавіну, махалі хусткамі. Некаторыя плакалі. Мы паводзілі сябе вольна, жартавалі. Нас, жменьку беларусаў, ніхто не аплакваў, нашыя плакальшчыцы засталіся далёка. Але і ўкраінкі нас шкадавалі і любілі. На ўскраіне старажытнага Глухава адна чарнакосая ўкраінка падбегла і пацалавала мяне – то быў першы хвалюючы дзявочы пацалунак у маім жыцці” [3, с. 41–42]. В. Быкаў паказвае маладое пакаленне, якое ненавідзіць гітлераўцаў і гатова ахвяраваць жыццё дзеля пазбаўлення сваёй зямлі ад ворага. У апавяданні “Сваякі” пісьменнік распавядае гісторыю двух хлапцоў – васемнаццацігадовага Алеся і семнаццацігадовага Сёмкі, якія надумаліся ісці ў партызаны. Маці спрабуе адгаварыць іх, напужаць – але безсэнсоўна. “Што яны зробяць у лесе, апроч як па-дурному загінуць, як загінуў той, што тыдзень назад з ночы ляжаў да поўдня на аколіцы, застрэлены нямецкай засадай, такі маладзенькі, прыгожы дзяцюк, у акрываўленай вайсковай сарочцы”, – думае жанчына [2, с. 392].

Натуральна, што эмоцыі ад пачатку вайны ў камандзіраў і салдатаў адрозніваліся. Таксама, як адрозніваліся эмоцыі у палкаводцаў імперскіх і савецкіх, і іх жаўнераў. Камандзіры паказваюць больш пафасу, і гэта зразумела, бо натхняць салдат было іх найпершым абавязкам. Вельмі яскрава такі момант “наладкі на патрэбную хвалю” сваіх падначаленых паказаны ў творы М.Гарэцкага “На імперыялістычнай вайне”. Камандзір батарэі, перад тым як абвясціць салдатам аб тым, што Расія ўвязалася ў чарговую вайну, прымае ад дзяжурнага рапарт, здароўкаецца, глядзіць на выстраеных маўклівых людзей і пачынае: “Вось, братцы! Прокляты наш вораг Нямеччына, захацела пакрыўдзіць адзінаверную з намі, рускімі, невялічкую Сербію. Але наш бацюшка-цар гэтага не дапусціць… Мы першыя не пачнем, але калі Нямеччына палезе, мы разб’ём ёй морду ў квас. Яна, пархатая, зажырэла, бо ўжо сорак год не ваявала. Дык мы ёй пакажам! А пакуль што, братцы, трэба пераехаць на зімовыя кватэры, каб быць бліжэй да ворага” [1, с.13]. Кожны момант яго прамовы быццам бы прадуманы да слова. Сам зваротак “братцы” павінен паказваць на еднасць і роўнасць, заахвочвае да шчыльнага супрацоўніцтва паміж камандзірамі і салдатамі. Другі момант – акцэнтаванне ўвагі на слабасць ворага: Нямеччына “зажырэла”, даўно не ваявала і, канешне, не здольная будзе супрацьстаяць такой моцнай і адмуштраванай арміі, як руская. Трэці момант – заступніцтва ўсемагутнага “бацюшкі-цара”, які не дазволіць пакрыўдзіць сваіх “дзетак”. Чацверты – закліканне да мужскога эга, але тонка разлічанае на своеасаблівую “мужыцкую” публіку, якой папаўнялі шэрагі імперскай арміі, – пра гэта сведчыць ужыванне камандзірам фразы “разаб’ём морду ў квас”. Але разам з тым ён мабыць і не думае, што кагосьці насамрэч, як Лявона Задуму, могуць зачапіць словы аб “адзінавернасці” напрыклад, бо ў шэрагах арміі, па сцвярджэнні вальнапісанага Лявона, хапала прадстаўнікоў розных канфесій. Рэакцыя будучых удзельнікаў вайны на словы камандзіра батарэі розная (адны маўчалі, задумаліся, другія павесялелі і зашумелі). Але гэта толькі вонкавыя праявы, а яны могуць быць несапраўднымі, і задаецца пытаннем, што ж насамрэч робіцца ў іх сэрцах? Надалей пісьменнік убачыць, што насельнікі лагера ўзрушаныя, ім не спіцца, а тыя, што павышэй чынам п’юць гарэлку, “святкуюць” пачатак вайны. А пройдзе яшчэ крыху часу, і нехта з камандзіраў, як Хітруноў, стане больш ласкавым да салдат з боязі, што на вайне яго могуць забіць свае ж падначаленыя “за розныя крыўды”. Іншыя, як старшы пісар, баяцца вайны. Затое салдаты на ўсю шпульку карыстаюцца новым абмундзіраваннем, выдадзеным з нагоды пачатку вайны, прадаючы на таргах старыя боты і вопратку. Казакі, якіх Лявон Задума характарызуе як прыгожых людзей “але вялікіх брахуноў”, выхваляюцца, што “перавярнуць дагары нагамі ўсю Германію”. Сусед Задумы па палатцы – юнкер Шалапутаў, пераўтвараецца пад час вайны з “адважнага ваякі” у баязлі ўца. Калі ідуць баі, ён ляжыць у куце ў сенцах, і на пытанне камандзіра адказвае, што ўдарыўся нагой і яна дужа баліць. А пасля і ўвогуле знік з лагера, на даволі працяглы час. Але і сам Лявон прызнаецца, што страх перад смерцю ці раненнем загнаў яго на нейкі час ў хату, у якой ён хаваўся.

Максім Гарэцкі і Васіль Быкаў паказваюць нетыповую з’яву, якая мела месца ў жыцці – радасць ці чаканне вайны. Як выдатныя псіхолагі, яны паказваюць першапрычыну ўзнікнення гэтага пачуцця, не “спісваючы” праблему банальна, на “рысы характару”. І калі Максім Гарэцкі знаходзіць вытокі чакання вайны ў жаданні “малых народаў” атрымаць незалежнасць і самастойнасць, то ў Быкава прычына хаваецца ў працэсах, якія адбываюцца ў гамадстве ў часы таталітарызма. Але і тут пісьменнікі паказваюць, што злом дабра не нажывеш, і сведчаць, што вайна не здзейсніла мары, а зноў жа, разбіла іх.

ЛіТАРАТУРА


1. Гарэцкі, М. На імперыялістычнай вайне / М. Гарэцкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1985. – С. 12–78.
2. Гарэцкі, М. Віленскія камунары / М. Гарэцкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1985. – С. 193–204.
3. Быкаў, В. Доўгая дарога дадому / В. Быкаў. – Мінск: Кніга, 2003. – С. 41–54.
4. Быкаў, В. Сваякі / В.Быкаў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1982. – С. 392–397.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова